Забегают в монастырскую трапезную и минские бомжи — пообедать на дармовщинку. Но с этим здесь строго — обед надо заработать. «*Полюбите труд — он есть замена времени*», — говаривал Сергий Радонежский своим братиям. Прав был Преподобный. Прекрасное сочетание милосердия и труда в священных стенах прорастает, как семя горчичное.

Популярность отца Андрея столь велика, что прихожане, да и работающие здесь люди, открыто заявляют: «*Если б не было отца Андрея, — не было бы здесь ничего!*». Оно и понятно. Велика заслуга того, кто сам об этом не говорит. Как-то в разговоре, пономарь Валерий, выразил беспокойство относительно сверхнагрузок отца Андрея: «*Как он выдерживает?*». А мне все хотелось узнать, сколько же он в сутки спит?

День священнослужителя расписан по минутам. Служба частенько затягивается до полуночи. В 6 утра отец Андрей в храме — готовится к утренней молитве. С 9-ти часов — литургия. Затем работа с больными, вечерняя служба. По вторникам — духовная беседа с прихожанами Петропавловского собора. Необходимо исповедать их, а потом и причастить.

А сколько желающих получить благословение известного священника! Повезло и мне. Получила благословение на написание очерка и первое причастие. Батюшка, не преминул высказаться на сей счет: «*Вот как бывает — приходишь за одним, а получаешь – другое*».

...Престольный праздник 4-го марта — День поминовения усопших. В нижней церкви строящегося монастыря звучит поминальная молитва. Отец Андрей закончил службу близко к полуночи. Очередь, человек десять паствы дожидалась возможности исповедаться. Батюшка никому не отказал.

«*Самое тяжкое и наказуемое в жизни каждого из нас – это грех. Грех во всех его проявлениях. Без таинства исповеди и причастия не может произойти духовного обновления души*», — эти слова произносятся отцом Андреем на каждой проповеди. Иисус Христос искупил нашу вину, взяв на себя грехи всего человечества. А обновленная, воскресшая душа уже осознанно, через молитву покаяния получает духовное возрождение и в этом ее спасение. ■

КОЛА ГІСТОРЫІ

КАНФЕСІІ

Валянціна Грыгор'ева, Алена Філатава

У канцы X стагоддзя на беларускія землі афіцыйна прыйшло хрысціянства. Годам прыняцця хрысціянства прынята лічыць 992 — год заснавання Полацкай епіскапскай кафедры. Але прыйшло хрысціянства не на пустое месца. Яму давялося змагацца са шматвекавымі язычніцкімі традыцыямі. Большасць даследчыкаў лічыць, што поўная хрысціянізацыя беларускіх зямель адбылася да канца XII – пачатка XIII ст. Некаторыя ж канец гэтага працэсу адносяць да другой паловы XIII і нават XIV ст.

У перыяд Кіеўскай Русі вызначаліся асноўныя сферы дзейнасці праваслаўнай царквы, узнікла буйная царкоўная землеўласнасць, сфарміравалася епархіяльная структура. Полацкая, Тураўская і інш. епархіі, у склад якіх уваходзілі беларускія землі, былі падпарадкаваны Кіеўскай метраполіі, у сваю чаргу падпарадкаванай Канстанцінопальскай патрыярхіі. Становішча праваслаўнай царквы на Беларусі ў XII–XIV ст. было непасрэдна звязана з развіццём царкоўна-рэлігійных адносін у Вялікім княстве Літоўскім і Кіеўскай метраполіі.

Язычніцтва і праваслаўе даволі мірна суіснавалі пад уладай вялікіх літоўскіх князёў. Стваральнікі новай дзяржавы, застаючыся язычнікамі ў душы, па палітычных меркаваннях з лёгкасцю зменьвалі старых багоў на новага хрысціянскага, балансуючы паміж усходнім і заходнім хрысціянствам і язычніцтвам. У 1246 г. прыняў «веру хрысціянскую з Усходу з многімі сваімі баярамі» князь Міндоўг. Але праз чатыры гады быў ахрышчаны па заходняму абраду. Гэта была своеасаблівая рэакцыя на выступленне супраць яго крыжацка-балцка-рускай кааліцыі ў 1249–1250 г.г. хрышчэнне давала князю магчымасць разлічваць на падтрымку крыжакоў.

У 1385 г. згодна Крэўскай уніі князь Ягайла атрымоўвае каралеўскую каруну. Рэлігійная сітуацыя ў ВКЛ паступова пачынае мяняцца. У 1387 г. было створана Віленскае каталіцкае біскупства.

Увесь перыяд існавання ВКЛ адзначаны саперніцтвам дзьвух асноўных канфесій: праваслаўнай і каталіцкай. Уніяцтва, уведзенае ў канцы XVI ст. прызвана было паслужыць прымірэнню між імі. Нешматлікія пратэстанскія канфесіі, якія з'явіліся ў другой палове XVI ст. (лютэранства, арыянства і кальвінізм), а таксама і стараверства (з канца XVII ст.) не адыгрывалі адметнай ролі. Як і нехрысціянскія канфесіі, што з'явіліся ў XIV ст. — іслам і іудаізм. Татары-мусульмане зберагліі канфесійныя сувязі з Крымам і Турцыяй, прызнаючы да канца XVIII ст. духоўную ўладу над сабой турэцкага султана, як халіфа ўсіх мусульман. А пры неабходнасці, па спрэчных пытаннях у справах веры, звярталіся да муфція Асманскай імперыі.

Яўрэйскія абшчыны выбіралі рабіна, які ўваходзіў у склад кагала. Галоўнымі сярод іншых у ВКЛ лічыліся абшчыны ў Брэсце, Гродне і Пінску. Напрыклад, ні адна з іудзейскіх абшчын не мела права выбіраць рабіна з іншай краіны без згоды рабіна і кагальных старшынь сваёй галоўнай абшчыны.

У канцы XVIII ст. на землях ВКЛ пражывала каля 39% уніятаў, 38% каталікоў, 6,5% праваслаўных, 4% старавераў, 10% іудзеяў, астатнія 2,5% прыходзіліся на пратэстантаў, мусульман і караімаў. На далучаных да Расійскай імперыі землях царскі ўрад дазволіў дзейнасць усіх канфесій. Але абвешчаная верацярпімасць была адноснай. На справе Расійскія ўлады імкнуліся ўсімі сродкамі ўзмацніць пазіцыі праваслаўя, найперш за кошт уніятаў, іх пераходу ў праваслаўе. Ініцыятарам пераходаў стаў Беларускі праваслаўны епіскап Георгій (Канінскі).

Пасля паўстання 1794 г., згодна з указам Кацярыны II, працэсу замены ўніяцтва праваслаўем быў нададзены новы штуршок. У 1795 г. Магілёўская праваслаўная епархія далучыла 105 уніяцкіх цэркваў з 34 святарамі і 120 тысячамі прыхажанаў. А ў Мінскай епархіі за 1795–96 гг. — 124 цэрквы, 39 капліц, 15 свяшчэннікаў і каля 85 тыс. прыхажан. Ратуючыся і пратэстуючы супраць гэтай палітыкі, уніяцкія вернікі сталі масава пераходзіць ў каталіцтва. Царскі урад забараніў каталіцкаму духавенству прымаць уніятаў. Умяшанне свецкай улады ў справы царквы, пераўтварэнне яе структур ў своеасаблівы працяг дзяржаўнага апарата ў Расійскай імперыі - адна з характэрных рысаў канфесійнай палітыкі. Таму і на тэрыторыі Беларусі царскі ўрад імкнуўся паставіць пад свой



ЭКСКУРС

СТАН ПРАВАСЛАЎЯ Ў БЕЛАРУСІ



Анатоль Астапенка

Напярэдадні бальшавіцкага перавароту 1917 года ў Беларусі існавала 5 епархій, якія ўваходзілі ў склад РПЦ. Бальшавіцкі ўрад на пачатку свайго кіравання вырашыў надаць Беларускай праваслаўнай царкве больш самастойнасці. І ў 1922 годзе была ўтворана Беларуская праваслаўная мітраполія на чале з епіскапам Мінскім Мельхіседэкам. Агульны працэс нацыянальнага адраджэння ў Беларусі, аднак, не паспеў закрануць у поўнай меры царкву.

Яшчэ пры жыцці Леніна пачалася страшэнная барацьба з рэлігіяй. І праваслаўе, як самая распаўсюджаная канфесія, першым прыняло на сябе ўвесь цяжар бальшавіцкага тэрору. Да 1988 года вялося безупыннае змаганне з рэлігіяй. Толькі пасля XIX Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі быў узяты курс на дэмакратызацыю рэлігійнага жыцця. І праз усе 90-ыя гады XX стагоддзя прайшоў імклівы колькасны і якасны рост усіх рэлігійных канфесій. У 1990 годзе быў утвораны Беларускі экзархат РПЦ — Беларуская праваслаўная царква (БПЦ). БПЦ кіруецца Сінодам на чале з мітрапалітам Мінскім і Слуцкім, Патрыяршым экзархам усяе Беларусі Філарэтам. Па колькасці вернікаў БПЦ з'яўляецца самай буйной з усіх іншых канфесій. На 1996 год БПЦ налічвала 964 рэлігійныя аб'яднанні (у 1986 г. іх было 369). За праваслаўнымі па колькасці абшчын ідуць пратэстанты — 604, католікі — 389. Характэрна, што колькасць праваслаўных абшчын размеркавана прыкладна аднолькава па абласцях Беларусі (за выключэннем Брэсцкай вобласці, дзе іх больш, чым у астатніх, — 282 абшчыны). Каталікі канцэнтруюцца найбольш у Гродзенскай вобласці (163 абшчыны), пратэстанты — у Брэсцкай (209 абшчын).

Па розных ацэнках, колькасць праваслаўных у Беларусі складае ад 60% да 80% ад усяго насельніцтва. Неадпаведнасць колькаснага складу праваслаўнага насельніцтва колькасці праваслаўных абшчын (апошніх значна менш па разліку на душу насельніцтва, чым у пратэстантаў ці католікаў) тлумачыцца тым, што многія грамадзяне Беларусі толькі лічаць сябе праваслаўнымі (некаторыя былі толькі ахрышчаны пры нараджэнні. Іншыя проста падтрымліваюць традыцыі роднай вёскі і г.д.). Большасць такіх вернікаў зусім не наведвае храмы ці бывае зрэдку. У католікаў, а яшчэ ў большай ступені ў пратэстантаў, кантакт з сваёй царквой значна лепшы. Па колькасці пратэстанцкія абшчын, напрыклад, з вялікай ступенню дакладнасці можна меркаваць і аб колькасці вернікаў.

Да 1989 г. у Беларусі быў усяго адзін праваслаўны манастыр — Жыровіцкі мужчынскі. Зараз налічваецца 5 мужчынскіх і 8 жаночых манастыроў. Дзе жыве 81 манах і 135 манашак (на 1997 г.).

Пры БПЦ існуе 7 праваслаўных брацтваў, якія складаюцца з прыхаджан і вядуць вялікую працу па распаўсюджванню духоўнасці. Сярод іх вылучаецца Беларускае праваслаўнае брацтва Трох Віленскіх Мучанікаў, што адной з галоўных задач ставіць дзейнасць па беларусізацыі Праваслаўнай царквы.

Багаслоўская адукацыя ў Беларусі ажыццяўляецца ў дзвюх вышэйшых навучальных установах — Мінскай духоўнай семінарыі і на факультэце тэалогіі Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта, а таксама ў спецыяльнай навучальнай установе па падрыхтоўцы рэгентаў царкоўных хароў — мінскім духоўным вучылішчы. У стадыі распрацоўкі багаслоўскай канцэпцыі навучання знаходзіцца зараз пытанне аб адкрыцці тэалагічных аддзяленняў у дзяржаўных ВНУ і найперш у БДУ.

БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ ЦАРКВЫ, АЎТАКЕФАЛІЯ

Праблема фарміравання нацыянальнай Беларускай царквы стаіць цяпер вельмі востра. І хоць царква аддзелена ад дзяржавы, афіцыйная моўная палітыка адбіваецца і на ёй. З 1989 г. у Беларусі пачаўся працэс нацыянальнага адраджэння, пачалася беларусізацыя ўсёй сферы грамадскага жыцця. Былі пэўныя поспехі. Пачаліся зрухі ў гэтым рэчышчы і ў жыцці Праваслаўнай царквы. Шэраг святароў увялі ў свае абавязкі чытанне пропаведзей на беларускай мове. Выдавецкі аддзел брацтва Трох Віленскіх Мучанікаў публікуе беларускамоўныя праваслаўныя календары, часопіс «Праваслаўе ва ўсім свеце», бюлетэнь «Ортапрэс» і іншую літаратуру. Брацкі царкоўны хор штотыдзень служыць на беларускай мове акафіст Тром Віленскім Мучанікам і малебен за беларускі народ. Перакладзена на беларускую мову і ўведзена ў абіходак літургія.

Гэтыя невялікія крокі — толькі пачатак адзінага працэсу беларуская нацыянальнага адраджэння. Вельмі не да месца аказаўся рэферэндум 1996 года, дзе было зацікавана двухмоўе. Аднак, калі пасля рэферэндуму пачаўся рэзкі націск на беларускае адраджэнне, а беларуская гаворка стала прыкметай належнасці да апазіцыі, то ў царкоўным жыцці гэта амаль не адчулася. Першая беларуская літургія, напрыклад, адбылася ў 1998 годзе. Тым не менш знешняя ўрадавая палітыка сучаснага кіраўніцтва Беларусі, накіраваная на інтэграцыю ў Расію, не дае падстаў атрымаць паўнавартасную нацыянальную царкву. Толькі незалежнасць ад Расійскай праваслаўнай царквы дасць магчымасць атрымаць Беларускую нацыянальную царкву. Але царкоўная самастойнасць (аўтакефалія) магчыма толькі пры ўмове дзяржаўнай незалежнасці і адсутнасці дыскрымінацыі беларускай мовы, якая існуе ў сучасным жыцці беларускага грамадства.

Для прыкладу згадаем сітуацыю з праваслаўнай царквой на Украіне, дзе гістарычныя і палітычныя ўмовы блізкія да нашых. Там некалькі гадоў таму назад утварылася Украінская праваслаўная царква Кіеўскага патрыярхату. Побач жа існуе і Украінская праваслаўная царква Маскоўскага патрыярхату, якая падпарадкоўваецца Маскве, як і экзархат БПЦ. Аднак аўтакефальная Украінская царква налічвае вялікую колькасць вернікаў і мае, напрыклад, у Кіеве адны з самых лепшых храмаў, у тым ліку знакаміты Уладзімірскі сабор. І калі гэтая царква пакуль што не прызнана кананічнай, пройдзе час, і ўсё ўладкуецца, як бы ні трызнілі апаненты аўтакефаліі пра «раскол». У свой час і Руская праваслаўная царква, якая аб'явіла аўтакефалію і ўвяла свой патрыярхат, была некананічнай. Але потым яе прызналі ўсе памесныя нацыянальныя цэрквы.

Можна з усёй упэўненасцю гаварыць аб тым, што перыяд ад 980 да 1596 года — гэта час існавання незалежнай Праваслаўнай царквы ў ВКЛ, час першай фактычнай аўтакефаліі нашай царквы. Другі перыяд — ад 1596 г. да раздзелаў Рэчы Паспалітай — суіснаванне Праваслаўнай царквы з каталіцтвам, уніяцтвам і пратэстанцтвам у беларускіх землях у складзе Рэчы Паспалітай. Гэты час быў цяжкім для праваслаўя, як і наогул для грамадскага жыцця і развіцця беларускай нацыянальнай культуры, бо дзяржаўнай рэлігіяй у Рэчы Паспалітай было каталіцтва, а беларуская мова выціскалася з ужытку. Гэты перыяд адметны распаўсюджаннем грэка-каталіцтва — асабліва ў форме ўніяцтва на землях ВКЛ. І ён унёс своеасаблівы заходні элемент у фарміраванне ментальнасці беларусаў.

Трэці перыяд руху за аўтакефалію праваслаўнай царквы пачаўся пасля бальшавіцкага перавароту. У 1922 годзе на Саборы ў Мінску была ўтворана Беларуская аўтакефальная Праваслаўная царква (БАПЦ), якая праіснавала да 1932 года. Ва ўмовах бальшавіцкай вайны з рэлігіяй небяспечна было і гаварыць пра царкоўнае адраджэнне і тым больш пра нейкую аўтакефалію. Але ў праваслаўнай царкве «крэсаў» — Заходняй Беларусі — адбылося шмат зменаў. Царква, якая дамінавала ў царскай Расіі, адыгрывала пануючую ролю, стала ў Рэчы Паспалітай пераследаванай рэлігіяй. Праваслаўе як вера большасці ў Заходняй Беларусі губляла сваіх вернікаў. Агульная колькасць праваслаўных беларусаў значна зменшылася: напрыклад, у 1911г. у Гродзенскай губерніі праваслаўных было каля 741 тыс., а ў 1920 г. ужо толькі 325 тысяч. Справе беларусізацыі царквы, а адпаведна і ўкраінізацыі на ўкраінскіх землях Польшчы, надзённа гучала як для беларусаў, так і для ўкраінцаў. І калі да рэвалюцыі поўным ходам ішла русіфікацыя царквы, то «пры паляках» праваслаўная царква сутыкнулася з дзяржаўнай палітыкай паланізацыі. Менавіта для аблягчэння апошняй задачы ў Польшчы была прынята аўтакефалія! Прынята гвалтоўна, насуперак кананічнаму праву і без якіх-небудзь саборных актаў. Аднак яна здзяйсняла непасрэднае падпарадкаванне царкоўных арганізацый дзяржаве. Тым самым аўтакефалія давала неабмежаваныя магчымасці для правядзення дзяржаўнай палітыкі ў царкоўным жыцці. Каб нейтралізаваць папярэдні працэс русіфікацыі, было дазволена ўжыванне беларускай мовы ў набажэнствах.

Заканчэнне на с. 6

КОЛА ГІСТОРЫ

НА БЕЛАРУСІ

кантроль не толькі каталіцкую і ўніяцкую канфесіі, але пратэстанцкія і нехрысціянскія. Адбывалася гэта шляхам стварэння сеткі прыходаў, набліжэння межаў епархій да межаў губерній, падпарадкавання духоўным праўленням і кансісторыям.

Да сярэдзіны XIX ст. большая частка насельніцтва Беларусі была пераведзена ў праваслаўе. У пяці губернях (Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Мінскай) пражывала 2.333.775 католікаў, 10.807 пратэстанатаў, 462.213 іудзеяў, 3.678 мусульман.

Пануючая роля праваслаўя сярод канфесій была зацверджана ў заканадаўчых актах. Згодна збору законаў 1857 г. праваслаўнае веравызнанне прызнавалася «первенствующим и господствующим» у Расійскай імперыі. За спакушэнне з праваслаўя ў іншае хрысціянскае веравызнанне каралі, пазбаўлялі ўсіх асабістых і дараваных правоў і прывілеяў, адпраўлялі ў арыштанцкія роты. Хуткімі тэмпамі будаваліся праваслаўныя храмы, пераводзіліся з унутраных губерняў Расіі святары.

Пасля паўстання 1863–64гг., каталіцкае духавенства падверглася рэпрэсіям, шмат каталіцкіх касцёлаў і манастыроў было скасавана і каталіцкіх вернікаў «кнутом и пряником» пераўтварылі ў праваслаўных. Дзейнасць каталіцкай царквы абмяжоўвалася шэрагам законаў. Мэтам паслаблення ўплыву каталіцкіх святароў на мясцовае беларускае насельніцтва служыў так званы план «распалячвання» (набажэнства і казанкі ў каталіцкіх касцёлах пераводзіліся з польскай мовы на рускую).

У 60–70 -ыя гады XIX ст. адбываюцца змены ва ўрадавай палітыцы ў адносінах да стараверах: прыхільнікам так званых *«шкодных»* сект была даравана палёгка. Дазвалялася ствараць школы граматы, адпраўляць дзяцей у агульныя навучальныя ўстановы без абавязковага вывучэння Закона Божага. Стараверы атрымалі права чыніць грамадскую малітву, выконваць адправы і багаслужэнне па сваіх абрадах. Пры ўмове, каб не было публічнага спакушальнага ўплыву на праваслаўе.

Пратэстанцкая канфесія пераважна ранейшаму была на Беларусі нешматлікай. Найбольш пратэстантаў (галоўным чынам лютэран) пражывала ў Віцебскай губерніі. Затым ішлі Гродзенская губ., Віленская, Мінская, Магілёўская. Улады, як правіла, вялікіх перашкод ім не чынілі, але пры магчымасці імкнуліся стрымліваць рост пратэстанцкіх вернікаў і культавых установаў.


Даволі значную ў колькасных адносінах групу склалі іудзеі. Калі на пачатку 60-ых гадоў у пяці губернях іх пражывала 432.217 чалавек, то згодна перапісу 1897 г. — 1.209.815. Другая палова XIX — пачатак XX ст. — даволі насычаны і супярэчлівы перыяд у развіцці іудаізму і палітыкі царскага ўраду ў адносінах да яго. Заставаліся актуальнымі (хаця і не такімі вострымі) ранейшыя праблемы межканфесійных адносінаў, рабінату і інш. Да іх дадаліся новыя: увядзенне рускай мовы ў яўрэйскіх навучальных і культавых установах, імкненне яўрэйскай моладзі да свецкай адукацыі і г.д.

Татары-мусульмане, што пражывалі ў беларуска-літоўскіх губернях, не прыцягвалі пільнай увагі ўлад. Па-першае, іх было не шмат: на пачатку 60-ых гадоў яны пражывалі ў асноўным у Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях у колькасці 6.196 чалавек; у 1897 г. іх стала 13.877. Па-другое, гэтаму спрыялі добрыя адносіны татар-мусульман з іншымі народамі і канфесіямі.

17 красавіка 1905 г. быў прыняты ўказ аб верацярпімасці. Ён не пахіснуў пазіцыі праваслаўнай царквы. Яна заставалася «первенствующей и господствующей». Але ўказ прызнаваў, што *«адпадзенне ад праваслаўнай веры ў другое хрысціянскае веравызнанне або веравывучэнне не будзе падвяргацца ганенням»*. У хуткім часе пасля абнародавання ўказа пачалі паступаць масавыя заявы аб прылічэнні да іншых канфесій. За 1905/–

1905–1907гг. па дадзеных обер-пракурора Св. Сінода, з праваслаўя ў каталіцтва па Расійскай імперыі перайшло больш за 170 тыс. чалавек, 10 тыс. — у пратэстанства.

Але указ аб верацярпімасці не прынес жаданага спакою ў рэлігійнае жыццё беларуска-літоўскіх губерняў. Пераходы вернікаў з праваслаўя ў іншыя канфесіі, галоўным чынам у каталіцкую, абвастрылі ўзаемаадносіны паміж праваслаўным і каталіцкім духавенствам, якое ў сваю чаргу сеяла гэтую нецярпімасць сярод паствы. ■



ПОЛИТОБОЗ

ПРЕВЕНТИВНЫЕ МЕРЫ

К «Маршу свободы-2» готовилась не только оппозиция, но и власть. Умерить пыл наиболее активного участника оппозиционных мероприятий, председателя БСДП, решили судебно следственные органы.

В канун 8 марта лидер белорусских социал-демократов получил постановление Минской городской прокуратуры, где сообщается, что Статкевич *«организовал и принял участие в групповых действиях, грубо нарушающих общественный порядок, сопряженных с явным неповиновением законным требованиям представителей власти, повлекших нарушение работы транспорта»*.

В вину председателю БСДП вменяется организация несанкционированного шествия 27 июля 1999 года, когда колонна демонстрантов, ведомая Статкевичем, не только *«выкрикивала различные лозунги и нецензурную брань»*, но еще и *«создавала помехи пешеходному и транспортному движению, при этом движение транспорта перекрывалось в общей сложности на 2 часа 9 минут»*. А также организация такого же шествия 17 октября. Но только тогда движение транспорта перекрывалось на 6 часов 27 минут.

УВОЛЬНЕНИЕ

Политический скандал на БТ разразился 9 марта после выхода в эфир «Крок-2». Ее автор и ведущий, Ярослав Беклемишев, был уволен. На БТ стоит вопрос о закрытии этой популярной программы. 10 марта, председатель Белтелерадио Кисель, после просмотра кассеты с эфира, отдал приказ об увольнении неугодного ведущего Беклемишева.

Ярослав сам комментирует событие. *«Присутствие такой значимой фигуры, как режиссер Хащеватский, явилось достаточным основанием, для моего увольнения. В программе речь шла о том, где брать деньги на белорусское кино, на какие средства существовать. Эфир вроде бы безобидный...»*

Теперь в трудовой книжке Беклемишева значится: *«уволен за грубое нарушение порядка подготовки и выдачи телепрограмм в эфир, которое выявилось в несоответствии эфирного материала «Крок-2» в эфире 9.03. 2000 содержанию микрофонной папки. Пр. 10.03. 2000»*.

За члена своей организации вступилась только Белорусская ассоциация журналистов. Президент БАЖ Жанна Литвина считает, что *«в последние годы никто так не загнан в сферу обслуживания, как электронные СМИ. Полная нетерпимость к любому альтернативному мнению. Это усматривается и в высказывании Мясниковича: «Государственные СМИ должны стать одним из важнейших механизмов реализации политики, разработанной и проводимой президентом»*. А на вопрос корреспондентов о перспективах БТ и об открытии второго канала первый замминистра связи Будай ответил: *«Телевидение у нас давно стало главным средством пропаганды»*.

ЭКСКУРС

СТАН ПРАВАСЛАЎЯ Ў БЕЛАРУСІ

Пачатак на с. 5

Але ўвядзенне беларускай мовы было нетрывалым дзейнікам. бо несла пагрозу для польскай культуры. У 1924 г. на канферэнцыях у Любліне і Беластоку сцвярджалася, што «або праваслаўе на тэрыторыі Люблінскага ваяводства паланізуецца, прынамсі, стане паланафільскім, або мусіць згінуць».

Тым не менш, на хвалі беларусізацыі царквы ў 1925 годзе ўзнік першы беларускі праваслаўны часопіс «Праваслаўны беларус». У 1928 г. з ініцыятывай стварэння беларускага прыходу ў Вільні выступіў Радаслаў Астроўскі. Дагэтуль там у Пятніцкай царкве вёў пропаведзі па-беларуску айцец А. Коўш. Шэраг дзяржаўных цыркуляраў рэгуляваў навучанне і прапаведаванне на беларускай мове. Аднак націск з боку дзяржавы даў свае вынікі. У 1935 годзе адбыліся ўжо першыя праваслаўныя богаслужэнні на польскай мове ў Беластоку і ў Гродне.

Такім чынам, Праваслаўная царква польскіх «крэсаў» Беларусі к 1939 г. стала інструментам дзяржаўнай палітыкі і часта выкарыстоўвалася як прылада паланізацыі. Палітыка паланізацыі Праваслаўнай царквы рэалізоўвалася паслядоўна і вынікова: да 1933 г. толькі на Холмшчыне і Падляшшы 137 цэркваў былі пераўтвораны ў каталіцкія касцёлы; спалена або разбурана — 39, разабрана — 55, замкнута і апячатана — 104.

У даваеннай Польшчы, у адрозненне ад Касцёла, дзе працэс паланізацыі беларусаў-прыхаджан дасягнуў амаль 100%, Праваслаўная царква ўсё ж здолела захаваць этнічную адметнасць беларусаў. Гэта асабліва яскрава было бачна пасля вайны. Нельга абвергнуць той факт, што Праваслаўная царква стала сімвалам беларушчыны на Беласточчыне. Ні школы, ні дзяржаўныя ўстановы не сталі асяродкамі захавання беларускай меншасці ў Польшчы. Імі стала Праваслаўная царква! Магчыма, такая сітуацыя звязана з асаблівасцю Польшчы як каталіцкай дзяржавы. Магчыма, прыклад Касцёла, як галоўнага інстытута польскай нацыі — які нават вышэй за дзяржаўныя структуры — стаў для беларускай меншасці прыкладам узаемаадносін паміж нацыяй і царквой. Магчыма.

Ва Усходняй Беларусі новая хваля руху за аўтакефалію Праваслаўнай царквы пачалася з прыходам нямецкіх войскаў у Беларусь у 1941 годзе. Пры кіраўніцтве начальніка нямецкай акругі Радаслава Астроўскага восенню 1941 года была ўтворана новая царква згодна наступным палажэнням:

1) Праваслаўная царква ў Беларусі кіруецца сваімі канонамі, і нямецкая ўлада не ўмешваецца ў яе ўнутранае жыццё.

2) Назва царквы: «Беларуская аўтакефальная праваслаўная нацыянальная царква».

Аўтакефалія павінна была быць зацверджана на Саборы. І 30 жніўня 1942 г. адбыўся Усебеларускі Сабор, на якім быў зацверджаны Статут Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы (БАПЦ), а канчатковае аб'яўленне аўтакефаліі было аднесена да выканання п. 113 Статута: «Кананічнае аб'яўленне аўтакефаліі адбудзецца пасля прызнання яе ўсімі аўтакефальнымі Праваслаўнымі цэрквамі»... Аднак кананічнае абвяшчэнне аўтакефаліі так і не адбылося. 7 ліпеня 1944 г. беларускія іерархі разам з адступаючымі немцамі выехалі ў Нямеччыну, і ў 1946 г. БАПЦ спыніла сваё існаванне.

Трэці раз БАПЦ была ўтворана ў 1948 годзе ў горадзе Канстанцы (Германія). Яна атрымала назву «БАПЦ на эміграцыі». Першым галавой царквы быў а. Сергій. У наш час кіруе «БАПЦ на эміграцыі» мітрапаліт Мікалай, які быў абраны мітрапалітам яшчэ ў 1984 годзе. Аднак у БАПЦ здарыўся раскол, і на іншым Саборы быў абраны мітрапаліт Ізяслаў. Такім чынам, цяпер у замежжы існуюць дзве царквы пад назвай «БАПЦ». У наш час ёсць прыходы БАПЦ у ЗША, Канадзе, Аўстраліі, Францыі, Бельгіі, Англіі і іншых краінах.

Усяго ў наш час маецца 15 аўтакефальных Праваслаўных цэркваў: Канстанцінопальская, Александрыйская (Егіпет), Антыяхійская (Сірыя, Ліван), Іерусалімская (Палесціна), Руская, Грузінская, Сербская, Румынская, Балгарская, Кіпрская, Эладская, Албанская, Чэхаславацкая, Польская, Амерыканская. Усе гэтыя аўтакефальныя цэрквы маюць кананічнае зацверджанне — прызнаны ўсімі Памеснымі праваслаўнымі цэрквамі і зацверджаны Канстанцінопалем. Аднак ёсць аўтакефальныя цэрквы, якія не маюць кананічнага падцверджання сваёй аўтакефаліі, — гэта, акрамя разгледжанай вышэй БАПЦ, наступныя цэрквы: Украінская замежная царква, Украінская аўтакефальная праваслаўная царква Кіеўскага патрыярхату, Македонская, Эстонская, Расійская замежная, Японская.

У Беларусі ў 90-ыя гады таксама пачаўся рух за стварэнне сваёй аўтакефаліі. На гэты час ён уяўляе сабою невялікую, вельмі разрозненую групу энтузіястаў. Найбольшую вядомасць сярод новых «аўтакефалаў» мае нядаўна адкрыты (28.01.1996) прыход пры Лідскім храме св. Панцеляймона, які абвясціў аб сваім выхадзе з-пад юрысдыкцыі экзархата БПЦ. Ёсць таксама незалежны прыход у Маларыце (а. Генадзь).

Падагульняючы, трэба сказаць наступнае: найбольш правільным шляхам царкоўнага развіцця ў Беларусі з'яўляецца паступовая беларусізацыя царквы праз утварэнне беларускіх праваслаўных брацтваў па ўсёй краіне, утварэнне беларускамоўных асветніцкіх рэлігійных цэнтраў, далучэнне да царкоўнага жыцця як мага больш беларускамоўных прыхаджан, свядомай інтэлігенцыі, увядзенне прадметаў і курсаў накшталт Закона Божага ва ўсіх навучальных установах і г.д. Але падкрэслю галоўнае — плён з усяго гэтага будзе толькі тады, калі на працэс беларусізацыі адгукнецца само насельніцтва. Шлях да Беларускай нацыянальнай царквы адзін — праз утварэнне незалежнай беларускай дзяржавы! Незалежнай не на паперы, а на самой справе. Толькі тады можна гаварыць і аб аўтакефаліі. ■

ПУНКТ ГЛЕДЖАННЯ

ЦЯЖКІ ГРЭХ ГАРДЫНІ

ЦАРКВА І ЛЮДЗІ, ПОГЛЯД ЗНУТРЫ

Галіна Зінкевіч

У пераліку грахоў перад споведдзю ў праваслаўных храмах гучыць: «...лічыў роўнымі ўсе рэлігіі». Яны сапраўды не роўныя і не могуць такімі быць, як няма роўнасці ні паміж людзьмі, ні паміж народамі. Ды ёсць ва ўсіх рэлігій агульная рыса: кожная з іх — ад трох буйнейшых, прызнаных сусветнымі, да самай дробнай секты – лічыць, што менавіта яна валодае ісцінай і найкароткім шляхам вядзе адэпта веры да Збаўлення.

У адной мінскай царкве доўга вісеў графічны малюнак, з якога вынікала, што ўсе хрысціянскія канфесіі — толькі чэзлыя галіны, а само праваслаўе магутны ствол. Непрымірымасць да іншых рэлігій і веравучэнняў трэба прызнаць вызначальнай на сённяшні дзень рысай Рускай праваслаўнай царквы, а таксама Беларускай як яе часткі. Каталікаў яна на дух не прымае з-за іх празелітызму (чытай — актыўнасці) і за два на самой справе сумніцельныя дагматы — аб беззаганасці (*«непогрешимости»*) Папы Рымскага і непарочным зачацці Божай Маці. Пратэстантаў (маюцца на ўвазе лютэране і кальвіністы) праваслаўе ўвогуле неахвотна адносіць да хрысціян на той падставе, што тыя адмовіліся амаль ад усіх таінстваў, за выключэннем двух.

З асаблівым імпэтам нападаюць *«ревнители православия»* на ўсходнія рэлігіі і вучэнні. Будызм, напрыклад, яны лічаць *«богаборчай»* рэлігіяй, хаця і прызнаюць за ім «некоторые аналогии с христианской моралью».

Але даводзілася чуць думку навукоўцаў, што будызм — гэта хрысціянства Усходу. Мала хто ведае, што ў візантыйскіх манахаў існавалі падобныя на будысцкія дыхальныя практыкі і сузіранне пупка. Што ж да катэгарычнага адмаўлення ўсяму Усходу ў праве на благадаць, то такое сцверджанне не падаецца занадта прадузятым.

Праваслаўныя святары часам з-за недахопу ведаў прыпісваюць іншым рэлігіям грахі, якія тым не ўласцівыя. Аднойчы бацюшка на поўным сур'ёзе даводзіў, быццам у Каране чорным па беламу напісана *«убей иноверца»*. Хто чытаў галоўную кнігу ісламу, запэўнівае, што нічога падобнага там няма.

Нічым іншым, як цемрашальствам, нельга растлумачыць варожасць уцаркоўленых людзей да ўжывання ў храме беларускай мовы. Яны так стаяць за царкоўнаславянскую, быццам яна ў свой час не лічылася гэткай жа ерассю ў параўнанні з кананічнымі мовамі — грэчаскай, лацінскай, яўрэйскай.

Усялякая праваслаўная царква (а іх у свеце 15) нясе на сабе адбітак пэўнага гістарычнага шляху, пэўнай ментальнасці і пэўнага дзяржаўнага ўладкавання. Агрэсіўная шавіністычная ідэалогія расійскай дзяржавы, у чыстым выглядзе выяўленая ў славянафільстве, пранікла ва ўсе сферы жыццядзейнасці, у характар цэлага народа. Несумненна, яна атруціла і Рускую праваслаўную царкву, якая заўжды была цесна знітавана з дзяржавай. Свяшчэнаслужыцелі ў публічных выступленнях падчас выказваюць смутак нават па Савецкаму Саюзу — настолькі пераважае ў іх імперскае пачуццё над хрысціянскім!

«З грахом трэба змагацца, а не з Масквою»,— казаў неяк беларускамоўным вернікам беларускамоўны бацюшка. Апусціўшы другую частку сказа, атрымаем слушную параду для ўсёй нашай нездаровай царквы. Бо што такое імперскасць? Гэта хвароба. Гэта амаль што манія велічы, спалучаная з маніяй праследавання. Адсюль, я лічу, і нястомныя пошукі праваслаўем ерасей ва ўласным лоне, і яго варожасць да ўсяго, што ідзе з Захаду і Усходу: масонаў, язычнікаў, магіі, тэасофіі, экуменізму і гэтак далей. Варта пагадзіцца з Бярдзяевым: *«Хрысціянства ёсць рэлігія любові, але мяркуюць аб ім па злосці і нянавісці хрысціян»*.

У мясцовых святароў па часткі нацыянальнай ідэнтыфікацыі — блытаніна. Выхаваныя на ідэалізаваных каштоўнасцях *«Святой Русі»*, звязаныя са старэйшым братам пупавінай веры і царкоўнай субардынацыяй, яны звыкла моляцца за *«русское воинство»* і не схільны лічыць самастойным народам сваіх пасомых. Тым самым яны ўносяць разлад і ў свядомасць вернікаў. Дык не здзіўляйцеся, калі Беларускае радыё ў рэлігійных перадачах пачынае ўсхваляць дабрадзейнасць і богаўгодныя справы якога-небудзь расійскага манарха. Гэта значыць, там хтосьці выяўляе артадаксальныя погляды той часткі кліра, якая не вельмі добра арыентуецца ў часе і прасторы.

Нельга сказаць, што мясцовыя свяшчэнаслужыцелі цалкам аднадушныя ў такога роду пытаннях. Тут шмат што залежыць ад ступені *«рускасці»* і ад агульнакультурнага ўзроўню. Тутэйшая, больш мяккая і гнуткая ментальнасць — не ў дзверы, дык у вокны — ўсё ж пранікае ў беларускую царкву.

Цікавы момант: там, дзе пахне зялёнымі, наша царква адразу забывае пра сваю непрымірымасць і гатова супрацоўнічаць з тымі самымі пратэстантамі. Яна пасылае на стажыроўку ў Германію прадпрымальных людзей, ажыццяўляе сумесныя сацыяльныя праекты, прымае дапамогу, абменьваецца візітамі і ўвогуле паводзіць сябе як нармальны партнёр. І выходзіць, што супрацоўнічаюць адны, а ў царкоўным друку кляйміць і разаблачае хтосьці іншы.

Асуджэнне ўсіх і ўся — ахілесава пята рускага праваслаўя. Цяжка зразумець, як яно, заклікаючы людзей да пакоры, умудрылася ўпасці ў такі цяжкі грэх. Самаўзвялічваннем прасякнуты ўся друкаваная і аўдыё-, відэёпрадукцыя, увесь лад паводзінаў. Непамерная гардыня царквы як арганізацыі найперш відна па саміх святарах. Зацятыя, прыгнечаныя, непрыветныя функцыянеры сталічных храмаў зусім не падцвярджаюць сабой ісціны, што Бог ёсць любоў. Пастаянна сутыкаючыся з прыхажанамі, ведаючы іх па споведзях, бацюшкі вельмі неахвотна вітаюцца, а часцей стараюцца прайсці міма без «добрага дня».

Здаецца, ім дастаткова вузкага кола царкоўнай абслугі, якая зарабляе пры храмах на хлеб з маслам. Набліжаны да кліра персанал можа даць фору самім святарам па часці знешняй набожнасці і пыхі. Ён не вельмі зацікаўлены, каб пашыралася кола актыўных прыхажан, і робіць усё, каб іх адштурхнуць. У каляцаркоўным асяроддзі квітнеюць канкурэнцыя і даносы ў епархію, інтрыгі і адкрытая пагарда да простых вернікаў — г. зн. тых, на чые ахвяраванні, падчас апошнія, царква якраз і існуе. «Хрысціянства знешняе, прытворнае, хлусліва-рытарычнае», на думку згаданага рускага філосафа, заканчвае свой век.

Але ж праваслаўная царква на Беларусі валодае магутным духоўным патэнцыялам. Цяжка пераацаніць значэнне супольнай малітвы, споведзі і прычасця для гарманізацыі ўнутранага свету чалавека, раскрыцця яго лепшых якасцей і здольнасцей. Неацэннай скарбніцай ведаў пра Бога і чалавека з'яўляецца, акрамя Святога Пісання, *«Добротолюбие»* і іншыя кнігі, дзе акумуляваны духоўны вопыт візантыйскага і рускага манашства, падвіжнікаў веры, святых айцоў.

Радуе, што вакол прыходскіх дамоў пачынае збірацца моладзь, што памалу растуць брацтвы; а дзе брацтва — там жывая работа, служэнне, дух любові і творчасці. А галоўнае, ёсць у нашых храмах святары, гатовыя выслухаць кожнага з нас, прыняць у сваё сэрца, здольныя адказваць на запатрабаванні часу, расці і дасканаліцца ў Хрысце. Бо сказана ж у пасланні Паўла да карынфянаў: «...Сеецца цела душэўнае, устае цела духоўнае». ■

КОНТАКТЫ

ВИЗИТ...

Окончание. Начало на с. 2

Не случайно шведскую сторону интересовало мнение белорусских оппозиционных политиков о целесообразности открытия в Минске своего посольства. Не использует ли режим этот факт для обоснования своего якобы признания Европой? Ответ был однозначен: режимы приходят и уходят, развитие же внешних контактов — на пользу демократии и народу.

Тема сотрудничества двух стран, логично переплеталась с темой возможностей и путей выхода Беларуси из конституционного кризиса. Конкретно — проблемой переговоров власти и оппозиции о проведении парламентских выборов. Председатель постоянной комиссии риксдага Виола Фурубелке подчеркнула, что Швеция поддерживает усилия миссии Х.-Г. Вика, но вместе с тем и поинтересовалась, есть ли у демократических сил программа реформ после смены режима. В ответ белорусская делегация попросила шведских экспертов дать заключение по концепции «Стратегия для Беларуси», разработанной рабочей группой Национального исполнительного комитета.

Встреча членов белорусской делегации с представителями шведских партий высветила еще одну политическую проблему — роль многопартийности в современных обществах. У них партии — основа демократии, у нас — опасный для власти элемент, почти враг. Именно партии в Швеции выступили инициаторами активизации сотрудничества с демократическими силами в Беларуси. Шведские социал-демократы объявили кампанию солидарности с белорусской демократией, рассчитанную на один год. В рамках этой кампании уже издан красочный бюллетень «За свободу Беларуси», открыт сайт в Интернете под красноречивым названием «Stop Luka!» ■

ХРОНИКА

СВОБОДУ...

Окончание. Начало на с. 2

В ответной речи подсудимый Михаил Чигирь заявил: *«Мое дело возбуждено не по заявлению лиц, которым якобы по моей вине причинен имущественный ущерб, а по материалам, поступившим из Совета безопасности и по личному указанию президента. Об этом свидетельствует докладная записка Шеймана с резолюцией Лукашенко (т. 10, стр. 199). Возбуждено после того, как я заявил о своем решении баллотироваться в президенты Республики Беларусь. Я бросил вызов человеку, обладающему в нашей стране неограниченной властью, не желающему соблюдать законы и забывшему о сроке, на который его избрали. Я стал опасным для режима.*

Предъявленные мне обвинения являются вымыслом следствия, не подкреплены доказательствами, построены на предположениях и домыслах, а в ряде случаев носят характер фальсификации фактов и событий. Могу оспорить каждое слово и абзац обвинительного заключения и сделаю это на протяжении процесса».

29 февраля. Общественный защитник Гарри Погоняйло заявил ходатайство об изменении меры пресечения Михаилу Чигирю с подписки о невыезде, на личное поручительство граждан и общественных организаций. Поручителями пожелали выступить председатель ОГП Станислав Богданкевич, главный редактор газеты «Згода» Алексей Король, общественное правозащитное объединение «Весна» и Белорусский Хельсинский комитет. Ходатайство было отклонено.

В этот день Чигирь должен был давать показания перед судом. Подсудимый заявил, про невозможность дачи показаний до заслушивания свидетелей и экспертов. Суд решил зачитать показания, полученные в ходе предварительного следствия.

